



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№37 (170). 7 — 13 верасня 2000г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 90 руб.

"Смяротная кара праз расстрэл" — такі прысуд напрыканцы мінулага тydня вынесла судовая калегія па Гродзенскай вобласці ў адносінах да 26-гадовага Уладзіміра Расола, які прызнаны вінаватым ў забойстве слонімцаў Віталя Хамякова і Анатоля Фідрыка.

Суровае пакаранне

Саўдзельнікі гэтага злачынства – 27-гадовы Анатоль Зенаў пакараны да 25 гадоў пазбаўлення волі, 33-гадовы Сяргей Крынчык – да 20 гадоў, 25-гадовы Сяргей Новікаў – да 15 гадоў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Алена Вільчкоўская, якая таксама праходзіла па гэтай справе ў якасці саўдзельніцы, амністіравана.

Падчас працэсу суд устанавіў наступны малюнак падзей, у выніку якіх былі забіты Хамякоў і Фідрык. Усё пачалося ў снежні 1998 года. На дыскатэцы "Оскар", што знаходзіцца ў мікрараёне "Энка", пабіліся Уладзімір Расол і Юрый Ганчароў. Бойка скончылася тым, што Ганчароў стукнуў нажом Расола. З цяжкім раненнем той трапіў у бальніцу. Пасля таго, як дактары яго вылечылі, Расол пачаў патрабаваць ад маці Ганчарова 5000 даляраў у якасці маральнай і матэрыяльнай кампенсацыі за нанесенае калецтва, бо сам Юрый знік ад следства і значыўся ў вышуку.

(Працяг на 2 стр.)

Взрослое ДЕТСТВО

Они терпеливо следят за взрослыми, пьющими пиво, при этом делают вид, что просто прогуливаются рядом.

Они работают быстро и слаженно, почти каждый день, примерно с 11 утра до 5 часов вечера.

Они неохотно делятся секретами своего бизнеса, а также подробностями своей жизни...

Они – двое худеньких мальчишек – Миша (11 лет) и Вова (8 лет).

Ребята собирали бутылки в слонимском городском парке.

Миша был в Слониме у бабушки на каникулах. Сам он из Барановичей. Решил немножко заработать. "На новые ботинки для школы собираю", – деловито пояснил мальчик. "А я – на часы, – продолжил более разговорчивый Вова. – Мой папа работает дворником, а мама – безработная, поэтому у нас не хватает денег. Я коплю все заработанное на обновки".

"А у меня мама сторожем работает, а отец – нигде...", – вставил Миша.

Примерно за день эти дети зарабатывают по 2 тысячи рублей, в выходные – 3 тысячи рублей, если повезет... Иногда еще сдают макулатуру, чтобы "были деньги на мороженое". По словам мальчиков, никто из отдыхающих их не прогоняет, не обижает. „Просто играть на улице в обычные детские игры – не хотят, они "занимаются делом", зарабатывают деньги на "нужные им вещи".

"Знаете, кем я буду, когда вырасту? Милиционером", – сам ответил на свой вопрос Вова. "А я, наверное, пожарным", – мечтательно добавил Миша.

Юные "бизнесмены" не могли долго со мной говорить, как сказал Вова, "работать надо"...

Ольга ШИНКЕВИЧ
Виталий ГИЛЬ (фото)



Фота Віталя Гіля

НАВІНЫ

Начальник, плати зарплату

Все учреждения и предприятия Беларуси, независимо от форм собственности и подчиненности во всех регионах республики, будут подвергнуты проверкам Комиссии по проверке своевременности выплаты заработной платы в Республике Беларусь, созданной 31 августа распоряжением президента Александра Лукашенко. Об этом сообщила пресс-служба главы государства.

Комиссию возглавил председатель Комитета государственного контроля Республики Беларусь Анатолий Тозик. В ее состав включены управляющий делами президента Владимир Гончаренко, министр статистики и анализа Владимир Зиновский, министр труда Иван Лях, председатель Комитета государственной безопасности Владимир Мацкевич, председатель государственного налогового комитета Константин Сумар и помощники президента – главные инспекторы по областям и Минску. Комиссии поручено до 5 сентября проверить выполнение указаний главы государства "о безусловной и полной выплате населению республики до 1 сентября заработной платы по июль этого года включительно".

Председателю Комиссии предоставлено право привлекать для выполнения этого поручения все необходимые силы и средства. Как отметил Анатолий Тозик в интервью белорусскому телевидению, до 0 часов 1 сентября руководители государственных органов, учреждений и предприятий всех форм собственности обязаны выплатить заработную плату по июль включительно. "Обращаюсь к руководителям государственных органов всех уровней и руководителям предприятий и учреждений: попытки искать причины невыполнения указания главы государства бесперспективны, таких причин попросту быть не может, – заявил глава Госконтроля. – Если где-то указание президента не выполнено, оно может быть следствием только халатного отношения руководителя к своим обязанностям и неумения организовать свою работу. Предупреждаю также на предмет попыток ввести в заблуждение членов комиссии и представить недостоверную информацию. Вся информация будет перепроверена, за такие попытки виновные будут нести ответственность вплоть до уголовной".

По официальным данным, к началу августа предприятия задолжали работникам 17 процентов месячного фонда оплаты труда.

Юрий АЛЕКСЕЕВ

АНОНС

"А КТО НАС ПОЖАЛЕЕТ, КТО ПОЙМЕТ НАШУ БОЛЬ".



Дмитрий Скурат

«Обратиться в редакцию побудили меня те противоречивые слухи, которые ходят по городу по поводу смерти нашего сына. Поэтому я хочу через газету внести ясность, как он умер и кто в этом виновен, – пишет в своем письме Тамара Скурат.

(ПРОДОЛЖЕНИЕ НА 2 СТР.)

ЛЕНІНСКІЯ КАРОВЫ – НА ЧУЖЫХ АГАРОДАХ



...Статак кароў калгаса імя Леніна літаральна здратаваў грады садовага таварыства "Здароўе".

(ЧЫТАЙЦЕ НА 3 СТР.)

"ДОРОГА В АД"



Российский политик и бизнесмен Борис Березовский считает, что "в случае с Лукашенко добрыми намерениями может быть вымощена дорога в ад...".

(ЧИТАЙТЕ НА 4 СТР.)

ЗДАРЭННІ

Оставил только записку

На прошлой неделе в деревне Коробчицы Гродненского района покончил жизнь самоубийством генеральный директор Гродненского производственного тонкосуконного объединения В.Крупин, 1949 года рождения.

Он повесился на своем дачном участке. Возле тела была обнаружена предсмертная записка: "В моей смерти прошу никого не винить! Прощайте, любимая жена, мои любимые сыночки, прощайте все добрые люди". Причина случившегося устанавливается.

Ася КУНИЦКАЯ

Суіцыд у бальніцы

У Мастах выкінуўся з акна чацвёртага паверха раённай бальніцы ўрач-стаматолаг, які ляжаў там на абследаванні.

44-гадовы мужчына на наступны дзень памёр ад атрыманых калецтваў. Ён пакінуў сіратамі двух непаўналетніх дзяцей.

Антон МАКЕЙ

"МАЗ" тараніў цягнік

На мінулым тыдні на чыгуначным пераездзе, што па вуліцы Пушкіна ў Слоніме, здарылася аварыя.

Аўтамабіль "МАЗ", які належыць мясцоваму водаканалу, выехаў на чыгунку і сутыкнуўся з пасажырскім дызелем. На шчасце, ніхто з людзей не пацярпеў. Вадзіцель машыны, які парушыў правілы дарожнага руху і выехаў на калейку, ігнаруючы гукавы і светавы сігналы, паспеў выскачыць з кабіны, якая ў выніку сутыкнення ператварылася ў груду металу.

Забралі каштоўнае

Некалькі дней таму ў слонімскую міліцыю звярнуліся жыхары з вуліцы Брэсцкай, 107/2.

Яны паведамілі, што ў той час, калі яны адсутнічалі, у іх кватэру патрапілі злодзеі, якія ўкралі відэамагнітафон, два залатых пярсцёнкі і 130 даляраў.

Валодзя ЯНЧУК

"А кто нас пожалеет, кто поймёт нашу БОЛЬ"

(Продолжение. Начало на 1 стр.)

18 июня 2000г. около пяти часов утра нашего сына, Скурата Дмитрия, 1981г. рождения, забрала скорая помощь с подозрением на аппендицит. Когда мы приехали в больницу, ему сделали обезболивающие уколы, ссылаясь на то, что он отравился клубникой. Однако в инфекционное отделение его почему-то не отправили. В этот день был профессиональный праздник – День медработника. Дежурил в это время хирург Коншин Н.А.. Ночью 19 июня Дима уже не мог больше терпеть боль и попросил, чтобы ему сделали ещё укол. Медики сослались на то, что так часто колоть нельзя. Тогда сын пошёл в ординаторскую и разбудил Коншина. После этого ему сделали операцию на аппендицит. В 5 часов 15 мин утра 19 июня его привезли в палату. Каждый день после операции сыну ставили капельницу, кушать не разрешали, и это длилось неделю. Всё это время мы были возле него. Палату, где лежал Дима, вёл Окунь. На мой вопрос: "Почему капельница, почему не разрешают кушать?"– ответ был такой, что ничего, мол, страшного, просто идёт воспалительный процесс от отравления клубникой. Дима каждый день говорил врачам, что болит живот, у него постоянно была температура около 38 градусов. На наш вопрос, что же с нашим сыном, хирург Коншин уверял, что ничего страшного нет, всё пройдёт. Хотя у сына уже началось вздутие живота. Мы полностью доверились врачам. Ровно через неделю, 24 июня, опять дежурил хирург Коншин. Утром Диму отвезли на зонд проверить желудок, но ничего не обнаружили. Опять поставили капельницу. И вновь Коншин сказал, что ничего страшного: живот уже помягче, вздутие поменьше, всё пройдёт. Поздно вечером в 21 час 20 мин., когда мы уехали домой, сыну сделали рентген. А после 22 часов Дима позвонил домой и сказал, что будут делать вторую операцию. Когда мы с мужем вновь приехали в больницу, операция уже шла. После 1 часа ночи 25 июня сына отвезли в реанимацию. Дождавшись оперирующего хирурга Коншина, мы от него узнали, что при первой операции он не увидел у сына так называемый дивертикул Меккеля, и что его тоже надо было удалять. Но опять врач сказал, что ничего страшного, организм молодой, крепкий, всё будет хорошо. На наши вопросы о здоровье сына 25 июня врачи отвечали: "Идёт к улучшению...". А уже утром 26 июня в реанимации врач Емельянчик сказал, что сын наш тяжёлый, так как у него идёт процесс нагноения. Коншин же попрежнему утверждал, что всё хорошо. Через два дня Диму переведут в хирургию. 27 июня неожиданно был собран консилиум по поводу здоровья нашего сына, и в этот же день он умер. Через неделю после похорон мы приехали в хирургию к Коншину Н.А. На вопрос моего мужа: "Чувствуете ли вы за собой вину", – он ответил в присутствии зав. отделением Кравченко: "Да чувствуем. При первой операции была занесена инфекция, но мы этого не хотели, хоть бы вы нас теперь расстреляйте". Вот после этого я решила обратиться в Министерство здравоохранения, чтобы помогли разобраться во всём этом. Ведь кто-то же должен ответить за смерть нашего сына. Он у нас никогда ничем серьёзным не болел, был здоровый, крепкий парень. И обратились мы за помощью к врачам вовремя. Когда приезжала к нам домой комиссия из Минска, я спросила: "Жил бы наш сын, если бы ему вовремя сделали повторную операцию?". Нам ответили: "Да, жил бы ваш сын, если бы врачи не ждали целую неделю".

(Окончание на 6 стр.)

НАВІНЫ

Ценный продукт

1 сентября в Беларуси на 5 процентов выросли цены на белую водку.

Теперь в розничной продаже пол-литровая "винтовая" бутылка водки "Кристалл-100" стоит 1.361 руб. (ранее – 1.299 руб.), "Кристалл-люкс" и "Белая Русь" – 1.405 руб. (ранее – 1.343 руб.).

Нынешнее повышение цен на водку стало восьмым в текущем году. Предыдущие происходили 21 января (на 30 процентов), 10 февраля (на 20), 18 марта (на 15), 21 апреля, 23 июня, 8 июля и 3 августа (на 5). С начала года стоимость водки выросла в 2,3 раза, тогда как потребительские цены в целом – в 1,7 раза.

БелаПАН

Перабор

Мастоўская СШ №5 разлічана на 1200 вучняў, але сёлета яе парог пераступіла 1500 дзяцей.

Заняткі ідуць у дзве змены. Адных толькі дзевятых класаў там восем паралелей.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Дети не оставят колхозы в беде

4 сентября в Гродненской области началась отправка студентов и учащихся колледжей и техникумов на сельхозработы.

Всего, в соответствии с распоряжением руководства облисполкома, для оказания помощи колхозам и совхозам области в своевременной уборке урожая сельхозпродукции на срок не более одного месяца предполагается задействовать 8 тысяч 85 учащихся и студентов. Они будут работать во всех районах области, кроме Зельвенского и Мостовского.

Ася КУНИЦКАЯ

У Слоніме застаўся толькі адзін беларускамоўны клас

У новым навучальным годзе ў слонімскіх школах застаўся толькі адзін беларускамоўны клас...

Гэты падрыхтоўчы клас дзейнічае ў СШ № 2, у ім навучаецца 15 дзяцей. У мінулым годзе такіх класаў было два: у другой і чацвёртай гарадскіх школах. Па словах работніцы гарадскога аддзела адукацыі Тэрэзы Юшкевіч, у беларускамоўныя класы не захацелі аддаваць сваіх дзяцей бацькі. "Мы праводзілі вялікую работу, угаворвалі іх, але бязвынікова", – сказала Тэрэза Юшкевіч.

Сяргей ЁРШ

В сентябре повысится пенсия

С 1 сентября будут повышены размеры всех трудовых пенсий.

У большинства получателей пенсии повысятся на 10,8 %, т.е. ровно на столько, на сколько повысилась средняя заработная плата в стране.

Средняя пенсия по возрасту составит 30300 рублей. Отметим, что за 9 месяцев этого года пенсия увеличилась в 2,3 раза.

Наталья ФУРСОВА

Суровае пакаранне

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стр.)

Урэшце, не дабіўшыся грошай ад бацькоў Ганчарова, Расол вырашаў даведацца пра месцазнаходжанне Юрыя праз яго сяброў. Для гэтага разам з Зенавым, Новікавым і Крынчыкам распрацавалі план. Згодна з якім яны дамовіліся з Аленай Вільчкоўскай, жыхаркай Баранавічаў, каб дзяўчына заманіла сяброў Ганчарова (Хамякова і Фідрыка) у пэўнае месца, дзе можна будзе "выбіць" з іх патрэбную інфармацыю. Дзесьці апоўначы 8 траўня 1999 года Вільчкоўская, пазнаёміўшыся з Хамяковым і Фідрыкам на дыскатэцы "Оскар", выманіла іх з залы і прывяла ў адну з кватэр, што на "Энцы". Там хлопцаў ужо чакалі. Аднаго звязалі рамянём, другому надзелі наручнікі. Не атрымаўшы патрэбных звестак, у дзве гадзіны ночы "чацвёрка" адвезла сваіх палонных на дачу бацькі Зенава, што знаходзіцца каля вёскі Якімавічы Слонімскага раёна. Там выбіццё інфармацыі праходзіла ў больш жорсткай форме. Спачатку Расол збіў юнакоў, а потым увёў кожнаму ін'екцыю невызначанага медпрыпарата, каб падавіць іх псіхічны стан і дабіцца звестак. Аднак і гэта не дало пэўных вынікаў. Тады, прыкладна ў 5 гадзін раніцы 9 траўня, Расол прыняў рашэнне забіць хлопцаў, каб замесці сляды ўжо зробленага злачынства. Спачатку расправіліся з Фідрыкам. Яму на галаву Расол надзеў поліэтыленавы мяшок, а потым накінуў на шыю шнур. У гэты час Крынчык і Зенаў трымалі ахвяру за рукі і ногі. Калі Анатоль перастаў дыхаць, яго аднеслі і скінулі ў падвал. Затым Расол запатрабаваў прывесці Хамякова, якога ўтрымлівалі ў машыне Новікаў, на той час яшчэ работнік слонімскай міліцыі. Віталя забілі такім жа самым чынам. Як паказалі вынікі судмедэкспертызы, хлопцы загінулі ад недахопу кіслароду.



Анатоль Фідрык

Віталь Хамякоў

Пазней таго ж дня, 9 траўня, на дачу зноў прыехалі Расол з Зенавым. Яны расчпанулі забітых, і іх целы адвезлі на старыя могілкі, што знаходзяцца за горадам, і там закапалі. Адзенне хлопцаў спалілі на звалцы.

Толькі праз дзевяць месяцаў выявілі месца захавання Фідрыка і Хамякова, якія ўвесь гэты час лічыліся без вестак зніклымі. 12 лютага 2000 года хлопцаў пахавалі па-людску.

Згодна з дзеючым заканадаўствам, асуджаныя на працягу сямі сутак з дня вынясення прысуду мелі магчымасць падаць апеляцыю ў вышэйшую судовую ўстанову, каб змяніць вынесенае пакаранне.

Валодзя ЯНЧУК



БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА ЎСЁ Ж ГУЧЫЦЬ

1 верасня, разам з пачаткам новага навучальнага года, у нашай краіне адзначаўся Дзень беларускай пісьменнасці і друку.

У гэты дзень і на афіцыйным узроўні вядуцца размовы пра беларускую літаратуру, а пісьменнікаў запрашаюць выступіць перад школьнай і студэнцкай аўдыторыяй. Чыноўнікі з экранаў тэлевізараў, у радыёэфіры і са старонак газет гавораць пра вялікае значэнне пісьменнасці і літаратуры ў жыцці грамадства. Пры гэтым, звычайна, не ўспамінаюць, што беларускамоўныя кніжкі выдаюцца мізэрнымі тыражамі, своечасова не выходзяць літаратурныя часопісы. Нават газета творчай інтэлігенцыі "ЛіМ".

Тым не менш, 1 верасня 2000 года павінна надоўга запомніцца старшакласнікам мастоўскіх школ і іх настаўнікам. У гэты дзень мясцовая суполка Таварыства беларускай мовы запрасіла ў Масты на свята беларускай пісьменнасці і друку барда Віктара Шалкевіча з Гродна, паэта і выдаўца Станіслава Судніка з Ліды, Сяргея Чыгрына са Слоніма і іншых гасцей. Але асабліва радуе, што самі мастаўчане – таленавітыя і прыгожыя людзі. І хоць мясцовыя ўлады адмовілі арганізатарам у арэндзе залы ў РДК, у памяшканні Мастоўскай райсельгастэхнікі сабралася досыць вялікая аўдыторыя. І хоць асноўная ўвага была скіравана на гасцей, але і сярод мастоўскіх школьнікаў, настаўнікаў і культработнікаў ёсць цудоўныя паэты, для якіх беларуская мова такая ж родная і натуральная, як Нёман. А ўрывак са спектакля "Несцерка", які паказалі васьмікласнікі Правамастоўскай сярэдняй школы Віктар Шайнога і Жэня Сідорык, быў выкананы надзвычай прафесійна і выклікаў заслужаныя апладысменты і смех гледачоў...

Атрымалася сапраўднае свята беларускага слова. А слова, якое знаходзіць водгук у душах тых, каму заўтра рабіць будучыню Беларусі, – пакідае надзею на лепшае.

Мікола КАНАНОВІЧ



Фота Віталя Гіля

Мастоўскія школьнікі на свяце беларускай пісьменнасці

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
.........(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 6 верасня 2000г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
Наклад 9100 экз.
Заказ № 2841
© «Газета Слонімская» Спасылка на «ГС» абавязковая
Ⓡ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

НАВІНЫ

У Мастах справілі "Дажынкі"

У суботу, 2 верасня, у Мастах адбылося раённае свята "Дажынкі". Мерапрыемства прайшло каля стадыёна "Нёман", дзе тры гады назад праходзілі "Дажынкі-97".

Былі ўзнагароджаны перадавікі жніва ў розных намінацыях. Шмат падарункаў было і ад мясцовых спонсараў. Ад іх вяскоўцы атрымалі міксер, тэлевізар, кухню вытворчасці ААТ "Мастоўдрэў".

Культурная праграма была досыць насычанай. Перад прысутнымі выступілі самадзейныя артысты Гледавіцкага дома культуры, мастацкі калектыў "Грымата" са Слонімскага раёна.

Вяскоўцы былі звезены на свята з усяго раёна і ўпершыню за апошні час мелі выхадны дзень.

Ні паліва, ні грошай

Ужо другі месяц амаль не выязджаюць у рэйсы машыны Мастоўскай райаграпрамтэхнікі.

Прычына адна – няма паліва, якое прадпрыемства не можа купіць з-за адсутнасці фінансаў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Дэлегаты на з'езд Саветаў

На Гродзеншчыне ідзе выбранне дэлегатаў на з'езд дэпутатаў Саветаў, які, у адпаведнасці з указам Аляксандра Лукашэнкі, адбудзецца ў канцы верасня.

Па словах старшыні Слонімскага гарадскога савета дэпутатаў Войцеха Угрыновіча, у адпаведнасці з устаноўленымі квотамі, ад Слоніма на з'езд будзе выбрана 5 дэлегатаў. Выбранне дэлегатаў праходзіла ў сераду, 6 верасня, на сесіі гарсавета. У той жа дзень прайшла і сесія раённага савета, на якой было запланавана выбраць 8 дэлегатаў на з'езд.

Сяргей ЁРШ

Непатрэбная вёска

На Мастоўшчыне працягваецца рэарганізацыя калгасаў.

Напрыклад, вёску Ляду з навакольнымі землямі і гаспадарчымі пабудовамі, што належыць саўгасу "Мастоўскі", вырашана далучыць да калгаса "Новы шлях". Кіраўніцтва ж гэтай гаспадаркі катэгарычна адмаўляецца ад такога ўзбуйнення.

Антон МАКЕЙ

Юбілейны хрэсны ход

З 3 па 5 верасня на Гродзеншчыне праходзіў юбілейны хрэсны ход.

Распачалі яго праваслаўныя вернікі ў Гродне, а закончылі ў Жыровічах. Вечарам 4 верасня гродзенцы на аўтобусах прыбылі ў Слонім. З нагоды хрэснага ходу ў 9 гадзін раніцы 5 верасня каля будоўлі Свята-Прэабражэнскага сабора ў Слоніме адбылася Боская літургія. Пасля вернікі і святары накіраваліся ў Жыровіцкі манастыр.

6 верасня ва Успенскім саборы Жыровіцкага манастыра адбылося ўрачыстае набажэнства з удзелам мітрапаліта Філарэта. Была ўшанавана памяць Серафіма Жыровіцкага (Шахмуця), які быў нядаўна залічаны да святых пакутнікаў XX стагоддзя.

Напомнім, што "ГС" сёлета ўжо пісала (№ 4, 20-26 студзеня 2000 г.) пра архімандрыта Жыровіцкага манастыра Серафіма Шахмуця, які загінуў у першыя пасляваенныя гады ў турме НКУС, вытрымаўшы ўсе катаванні, здзекі і не прызнаўшы фальшывых абвінавачванняў.

Алег ТАЧОНЫ

ЛЕНІНСКІЯ КАРОВЫ – НА ЧУЖЫХ АГАРОДАХ

Мы ў той жа дзень выехалі на месца, каб даведацца, што адбылося на самай справе.

Прыехаўшы, убачылі, што амаль на кожным участку працавалі людзі, убіралі тое, што засталося пасля набегу калгасных рагуль. Каровы сапраўды наведалі кожны ўчастак. Камусьці з гаспадароў пашанцавала больш, камусьці менш. Першай у нас была размова з пенсіянеркай Ліліяй Засімовіч, якая на працягу многіх гадоў адна апрацоўвае свае соткі. Яе дзялка, здаецца, пацярпела найбольш. Каровы знішчылі грады буракоў, капусты, паламалі і пашкодзілі саджанцы яблынь і вішні, здратавалі грады трускалак, не абмінулі агуркі, фасолю і іншае. Лілія Іванаўна сказала, што панесла вялікія страты, і вінаватымі ў гэтым лічыць кіраўніцтва калгаса імя Леніна і пастухоў, якія не ўпільнавалі скаціну. І яшчэ жанчыну вельмі абурыла тое, як з ёй потым размаўляў старшыня калгаса Карл Свіб, які, па словах Ліліі Іванаўны, сказаў, што "калі ў цябе каровы вырвалі яблыню, то можаш пайсці да мяне і выкапаць любую разам з яблыкамі...". Дарэчы, на кіраўніка гаспадаркі скардзіліся і іншыя дачнікі. На іх думку, Карл Канстанцінавіч не ўспрыняў усур'ёз тыя праблемы, якія прынеслі людзям калгасныя рагулі. А ў статку, што пасецца ля лецішчаў, больш за дзвесце галоў. Вось такая "арда" прайшлася па градах.



Аляксандр Серы: "Тут была мая капуста..."

30 жніўня ў рэдакцыю нашай газеты завітаў слонімец Яраслаў Шабан, які паведаміў, што статак кароў калгаса імя Леніна літаральна здратаваў грады садовага таварыства "Здароўе", лецішчы якога знаходзяцца недалёка ад вёскі Сакалова.

Сусед Ліліі Засімовіч Аляксандр Серы толькі развёў рукамі і, паказваючы на граду, сказаў: "Тут была мая капуста...".

Можна зразумець абурэнне людзей, якія ўклалі шмат працы, каб выраслі тыя ж буракі ці капуста, а потым іх – карове пад хвост. Але чаму пастухі не ўпільнавалі скаціну?

Як вынікае з размовы з адным з іх, Юрыем Гарбуном (ён дзяжурыў у тую ноч), хлопец проста не змог справіцца з "бунтам" рагуляў. Ноч была вельмі цёмная, а кіраўніцтва калгаса не выдае пастухам нават электрычных ліхтароў. Да таго ж, падселі батарэйкі ў электрапастуху, а драцяная агароджа без току – для каровы не перашкода. Таму некалькі кароў парвалі дрот і скіравалі да лецішчаў, а за імі – астатнія. Пакуль у цемры пастух агледзеўся, што адбылося, ратаваць становішча было ўжо позна. Тут трэба адзначыць, што да гэтага выпадку пастухі дзяжурылі на пашы па адным. Суткі працуе – суткі выхадны. Цяпер, пасля гэтага выпадку, ужо пасуць два чалавекі. Ля вугану стаіць дзіравы стары аўтобус, які зусім не ратуе ад дажджу, а армейская тыпу плашч-палаткі, якія ім выдалі як спецвопратку, па словах пастухоў, прапускаюць вільгаць... Такія вось умовы працы. Ды і заробак у пастуха ў лепшы час не дасягае трыццаці тысяч у месяц.

У гэты ж дзень, крыху раней за нас, на лецішчы прыязджала камісія ў складзе старшыні таварыства "Здароўе", старшыні калгаса імя Леніна і двух прадстаўнікоў райвыканкама. Паколькі паступіла калектыўная скарга, задачай камісіі было – ацаніць маштабы нанесенай людзям шкоды. Пахадзілі па ўчастках, паслухалі, запісалі. Але абяцанняў наконт магчымай кампенсацыі за панесеныя страты не давалі. Параілі толькі дачнікам абгарадзіць участкі, тады, маўляў, ніякая скаціна не патопча грады.

У тэлефоннай размове старшыня Слонімскага райвыканкама Станіслаў Здановіч паведаміў, што існуе парадак прынясця рашэння па такіх пытаннях у адміністрацыйным ці судовым парадку. У дадзеным выпадку камісія яшчэ не прыняла пэўнага рашэння па выніках праверкі, не быў складзены пратакол, таму будзе ці не будзе выплачана кампенсацыя пацярпеўшым, гаварыць рана.

Мікола КАНАНОВІЧ,
Віталь ГІЛЬ (фота)

ФЕЛЬЕТОН

ПАДМАН, БАБЫ!



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Была я нядаўна ў Францыі. Унук мой, прыватны прадпрымальнік, грошы някепскія зарабляе. Дык мне пуцёўку купіў. Я і не хацела ехаць, але ён прычапіўся:

— Прагуляйся, — кажа, — баба, па Еўропе. Хоць свет паглядзіш, а то ж ты, акрамя райсабесу, нідзе не была.

Паехала я. І ўсё бачыла сваімі вачамі. Падман, бабы!

Падман, што пра іх кажуць ды ў газетах пішуць. Нібыта на Захадзе людзі надта ўдалыя, таму і жывуць добра. Не слухайце іх, слухайце мяне.

Прыехалі мы да Парыжу. Туды-сюды павярнуліся, а потым нашу групу павялі нейкую Эйфелеву вежу глядзець. Во дзе марнатраўства! Каб вы бачылі! Стаіць высачэзны слуп — не слуп, вежа — не вежа. Для чаго яна — ніхто толкам сказаць не можа. Помнік, маўляў. Ды хіба я помнікаў не бачыла? Гэта жарты, стольκі будаўнічага матэрыялу змарнавалі чорт ведае на што! У нашым калгасе, вунь, кароўнікі будаваць пачалі ды кінулі, бо матэрыялу няма, а тут што вырабляюць!

— Дзе той Эйфель, хачу з ім пагаварыць, — прычапілася я да кіраўніка групы. А ён ціхенька штурхае мяне ў бок і просіць:

— Ціха, бабка, а то яшчэ хто пачуе. Французы многія панашаму разумеюць...

— Няхай чуе, — кажу, — а што тут такога? Памажы мне Эйфеля знайсці, а то я ў французаў папрашу.

— Няма яго, — адказвае.

— А дзе?

— На Елісейскія палі паехаў... бульбу баранаваць.

— Ну, — думаю сабе, — раз чалавек справай заняты, то турбаваць яго не варта.

Але і тут падман! Няма там ніякіх Елісейскіх палёў. Усё заасфальтавалі. А назву не мяняюць, палямі па-ранейшаму называюць. Я думала, там буракі ці бульбу кабеты полюць, пагутарыць з імі хацела, пра наша жыццё расказаць.

А пра сена навошта напляілі? Дома мне ўнук казаў, што горад Парыж стаіць на сене. Вядома ж, яму манілі, дык і ён мне тое самае далдоніў. Няма там ніякага сена. Горад як горад. А сена нідзе не бачыла.

Ой, гультаяватыя там людзі! Красці і то ляную цца. Памятаю, начавалі мы ў гасцініцы, а насупраць яе, акурат праз вуліцу, такія прылавачкі са шкла параблены і ўсякае дабро ляжыць. А золата, золата, аж у вачах трымціць! Днём ім гандлююць, а наначакрываюць шклом і так пакідаюць. Я, як гэта ўбачыла, то цэлую ноч сну не было: чакала, калі ж хто прыйдзе дабро красці. Так і не дачакалася. І настолькі была ўражана — вам не перадаць! У нас ля вёскі адночы бульбу калгасную капалка вытрасла, а падабраць не паспелі, бо сцямнела. Дык да раніцы клубні нібы скрозь зямлю праваліліся. Толькі дробныя ляжалі. А тут золата... Я так мяркую, спаць вельмі любяць гэтыя французы. Ленавалася ўстаць ды кулаком па вітрыне ахнуць. Там жа ні вартаўніка не было, ні сігналізацыі. Я сама бачыла.

А іхнія кабеты — гультайкі! Бабачкі, не паверыце! Яны ж калготкаў, як парвуцца, не цыруюць. І не мыюць. Проста выкідваюць прэч. Во да чаго дайшлі! Адночы ў гасцініцы, бачу, пусцілі мае калготкі вочка. І каб на яго халера, пабегла гэтак хуценька, нібы прусак. Думаю, край трэба зла віць, а то потым дзіра будзе. А тут іголкі няма. Я пайшла да дзяжурнай і папрасіла іголкі.

Калготкі, — кажу, — трэба зашыць.

Дык яна на мяне так вочы вылупіла, нібы я ёй збіралася зашыць рот.

— А чаго вы на мяне так гледзіце? — пытаю. Яна па-нашаму крыху разумела.

— Дзіўлюся, — кажа, — бо ў нас калготкаў век ніхто не зашывае і не мые.

— Так і ходзіце ў брудных ды дзіравых?

— Навошта! Мы іх проста выкідаем...

— Куды? — пацікавілася я, а сама думаю, вось каб знайсці тое месца, для сябе што падабрала б.

— А для чаго вам? — пытае яна.

— Ды свае вось хачу выкінуць...

Падманула я яе. Каб калготкі з адным пушчаным вочкам выкідвала, то мяне з хаты прагналі б. Тым больш, што гэта была не мая рэч, а нявесткі. Яна мне спецыяльна дала, каб у Еўропе пафарсіла. Ды я гэтыя калготачкі зашыю ды яшчэ ў туфлях панашу. А потым, як больш парвуцца, у ботах можна будзе цягаць. Ого, выкідваць! Мы іх так зашываем! Мы іх так носім, аж пакуль з нагі не звалiцца.

Цяпер бачыце, бабы, які падман пра іхняе жыццё пішуць? А якія там кабеты худыя! Скура ды косці! Такая бідон з малаком на машыну не ўскіне. І мяшка з салетрай не падыме. Бо есці сабе шкадуюць. Кропельку з'ядуць, кропельку вып'юць. Такія з іх і работніцы. Елісейскія палі заасфальтавалі, калготкі і тыя сабе не памыюць. Я ж там была. Усё на свае вочы бачыла. І добра, што паехала. Цяпер мяне ніхто не падмане.

Хачу яшчэ і ў Англію з'ездзіць, але ўнук сказаў: годзе! Ты, кажа, у Францыі сваімі пытаннямі ўсім надакучыла.

Ніхто сёння, бабы, праўды не любіць. Што ў Еўропе, што ў нас — усюды падман. Падман, мае родныя!

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

"ДОРОГА В АД"

Известный российский политик и бизнесмен Борис Березовский считает, что союзное государство Беларуси и России нереально. Такую точку зрения он высказал 1 сентября на пресс-конференции в Крынице-Гурской (Польша) в рамках проходящего здесь экономического форума "Польша — Восток".


Фота IREX/ProMedia

По словам Березовского, "ни у кого нет вопросов, что это очень близкие народы, что русские и белорусы ближе, чем, например, русские и татары, и желание создать союз — естественное. Эту идею поддерживает основная масса населения в России и Беларуси". Реализовать же этот союз, считает Березовский, "малореально". По его словам, создание союзного государства возможно в двух видах — или на основе равноправного партнерства, или Беларусь должна войти шестью областями в состав России. "Как только заходит речь о равном партнерстве, татары говорят — а чем мы хуже Беларуси? Потому что нас меньше, чем их, или потому что они славяне, а мы нет? — сказал Березовский. — И ингуши с чеченцами говорят то же самое, и они абсолютно правы. Это путь превращения России из федерации в конфедерацию".

Борис Березовский дал оценку белорусскому президенту: "Он человек, безусловно, думающий, безусловный политик и политикан. Он одновременно пытается думать стратегически, что у него получается значительно хуже, чем думать тактически, то есть заниматься серьезной политической интригой. Ментально он, как мне кажется, человек не демократических, а авторитарных взглядов. Он не понимает, что такое реально свободный человек, и в этом ничего нет особенного, потому что подавляющая часть россиян и белорусов думает так же. Намерения у него добрые, но в случае с Лукашенко добрыми намерениями может быть вымощена дорога в ад. Я не замечал, что он ставит свои интересы выше интересов своих граждан, — он просто так понимает их интересы".

Вячеслав БУДКЕВИЧ

Откат

"Еще не было такого отката" в белорусско-российских отношениях, как сейчас."Мы подошли к очень опасной черте в наших отношениях, дальше так быть не может".

Об этом 30 августа на встрече с лидером Коммунистической партии Российской Федерации Геннадием Зюгановым заявил глава белорусского государства Александр Лукашенко.

По словам президента Беларуси, у него складывается такое впечатление, что "те люди, которые когда-то дико препятствовали подписанию последнего договора, сегодня конкретно занимаются разрушением всего того, что было создано в связи с тем, что президент России так или иначе отвлечен на те события, которые прошли в последние месяцы".

Лукашенко считает, что назрел серьезный разговор со всеми ведущими политиками России о судьбе белорусско-российского союза.

С мнением белорусского лидера согласился государственный секретарь Союзного государства Павел Бородин. Комментируя заявление Лукашенко по окончании заседания Совета министров Союзного государства, он, в частности, сказал, что Россия также озабочена сложившейся ситуацией. Причина возникших проблем в белорусско-российских отношениях, по его словам, заключается в том, что их пытаются решить "чисто экономическими методами, не затрагивая политическую, так сказать, независимость Беларуси".

БелаПАН

МОЗГИ — НА ИНВЕНТАРИЗАЦИЮ

До 1 января 2002 года коммерческие и некоммерческие организации Беларуси, обладающие правами на объекты интеллектуальной собственности, должны провести их инвентаризацию и отразить ее результаты в бухгалтерском учете.

Это предусмотрено указом президента Беларуси "О государственном стимулировании использования объектов интеллектуальной собственности", подписанным 31 августа и вступившим в силу 2 сентября.

Документом предусмотрено проведение инвентаризации следующих объектов интеллектуальной собственности: изобретения, полезные модели, промышленные образцы, селекционные достижения, товарные знаки, компьютерные программы. Выявленные при инвентаризации неучтенные объекты интеллектуальной собственности необходимо оприходовать и зачислить соответствующую денежную сумму на финансовые результаты коммерческой организации или на увеличение доходов некоммерческой организации. При этом коммерческие и некоммерческие организации Беларуси освобождаются от уплаты в бюджет налога на прибыль, исчисленного из прибыли, полученной в результате инвентаризации объектов интеллектуальной собственности.

В 2001–2002 годах предусмотрено освободить обороты по предоставлению прав на использование объектов интеллектуальной собственности на территории Беларуси от уплаты налога на добавленную стоимость и налога на прибыль, исчисленного из прибыли от предоставления указанных прав. Суммы прибыли и высвободившихся денежных средств в связи с предоставлением вышеперечисленных льгот предписано направлять на финансирование научно-исследовательских, опытно-конструкторских и опытно-технологических работ, а также капитальных вложений по приобретению объектов интеллектуальной собственности. В противном случае эти средства будут подлежать взысканию в бюджет.

Юрий АЛЕКСЕЕВ

Прогноз погоды по телефону

С 1 сентября у жителей Беларуси появилась возможность воспользоваться услугами всемирной телефонной информационной системы "Аудиотекс".

Договор об оказании услуг подписали республиканское государственное объединение "Белтелеком" и совместное белорусско-израильское предприятие "ТелеколлИнфо".

По информации, полученной БелаПАН в управлении маркетингом РО "Белтелеком", "Аудиотекс" представляет собой информационную систему, основанную на своеобразном слиянии компьютера и телефона. Эта система дает абоненту возможность посредством набора определенного номера выйти на связь с компьютером — источником информации или оператором и получить интересующие его сведения. "Аудиотекс" предоставляет возможность получать по телефону консультации, информацию о товарах и ценах, курсах валют, погоде, организовывать благотворительные акции, конкурсы, опросы, игры и т.д.

В каждой стране имеется свой код выхода на услуги "Аудиотекса". В Беларуси это — 602, и полный формат набора выглядит так: 8-602-ххх-ххх.

Необходимо отметить, что с 16 мая нынешнего года услуги "Аудиотекса" предоставляются абонентам минских телефонных станций. Первыми услугами стали "знакомство", "живые разговоры" и "викторины".

Стоимость одной минуты соединения с информационной системой "Аудиотекс" составляет от 600 до 700 рублей. Услуги предназначены только для совершеннолетних. Кроме того, у абонента будет 15 секунд бесплатного соединения с системой, в течение которого звучит информация о содержании и стоимости услуги, а также предоставляется 3-4 секунды на принятие решения о продолжении разговора. Счет за услуги "Аудиотекса" включается в ежемесячный счет за услуги электросвязи.

БелаПАН

СКОЛЬКО СТОИТ ВИЗА?

За последние годы Республика Беларусь установила с некоторыми странами безвизовый режим. Например, с Южно-Африканской Республикой.

Сохраняются безвизовые поездки белорусских граждан в Турцию, на Кипр и пока в соседнюю Польшу. Однако большая группа стран (Болгария, Румыния, Чехия и др.), в связи с гармонизацией отношений с Европейским Союзом, решили ввести визы для граждан Беларуси.

Для сравнения: в японском посольстве в Беларуси одноразовая виза стоит 10 долларов США, а вот в белорусском посольстве в Токио такая же одноразовая виза стоит 8.600 йен (почти 86 долларов США). Немецкую визу сроком до 30 дней в консульском отделе посольства ФРГ можно купить за 40 немецких марок. Раньше она стоила немного дешевле — 20, а потом 30 марок. Полугодовая немецкая виза стоит 70 марок, а годовая — 100. Зато белорусская виза для немцев стоит уже 100 марок, а многоразовая — 500 марок.

Существенная разница существует и между белорусской и израильской визами. В Минске однократная виза стоит 17 долларов США, а в Тель-Авиве — 265 шекелей (около 66 долларов США).

За однократную Шенгенскую визу, открываемую в Посольстве Франции в Беларуси, надо платить 24 доллара США. За получение белорусской французы должны отдать почти в два раза больше — 300 франков (почти 46 долларов США).

Незначительно отличаются по стоимости однократная белорусская виза в Великобритании и такая же британская виза в Беларуси — 40 фунтов (около 60 долларов США) и 54 доллара США соответственно. В американском посольстве за получение однократной визы надо заплатить 45 долларов за визит к консулу, а многократная обойдется уже в 100 долларов плюс те же 45 за визит к консулу. В белорусском посольстве в Америке наша однократная виза стоит 50 долларов, а многократная — 170 долларов.

Визы в соседние Литву и Латвию стоят столько же, сколько и белорусские визы в этих государствах. 20 долларов в Литве и 15 в Латвии. Кстати, в посольствах Литовской Республики во всех странах мира литовская виза стоит одинаково — 20 долларов.

Василий ЯКОВЛЕВСКИЙ, "Наша свабода"



Фота IREX/ProMedia

Кубинский лидер Фидель Кастро награждает Александра Лукашенко медалью Хосе Марти во время официального приёма во дворце Революции в Гаване 2 сентября 2000г.

ТАТАРЫ СОЗДАЮТ СВОЮ ФЕДЕРАЦИЮ

Днями в городе Соколка (Белостокское воеводство Польши) завершилась работа ежегодной летней Международной академии знаний о польских татарах.

Как сообщил БелаПАН руководитель белорусской делегации, один из лидеров татарской общины страны Ибрагим Канапацкий, во время работы академии был подписан акт о создании "Millet" (в переводе с татарского — народ) — международной федерации татар Беларуси, Литвы, Польши и Украины. По словам г-на Канапацкого, создание этой международной организации вызвано тем, что на землях четырех стран более 600 лет проживают потомки татар Великого княжества Литовского. История и культура этого самобытного народа численностью около 20 тысяч человек отличает его от остальных татар, в том числе населяющих Крым и Поволжье, заметил г-н Канапацкий. По его словам, федерация продолжит традиции Комитета татар Польши, Беларуси, Литвы и Украины, созданного в феврале 1917 года представителями татарских общин этих стран. В принятой декларации отмечается, что целью "Millet" является сохранение культурного наследия народа, его традиционной религии ислам и вхождении федерации в европейские структуры. Для руководства организации создана временная рада, в состав которой вошли представители белорусских татар.

Марат ГОРЕВОЙ

Стричь будут по сертификату

Как стало известно БелаПАН, с 1 июля 2001 года в Беларуси будет введена обязательная сертификация услуг парикмахерских.

В связи с этим Государственному комитету по стандартизации, метрологии и сертификации, совместно с Белорусским государственным объединением организаций бытового обслуживания населения, правительство поручило разработать до 1 января 2001 года порядок сертификации услуг парикмахерских, а также организовать обучение и аттестацию экспертов-аудиторов по сертификации услуг парикмахерских. Кроме того, к этому же сроку должны быть подготовлены и аккредитованы в Национальной системе сертификации органы по сертификации услуг парикмахерских; подготовлены и утверждены требования, в соответствии с которыми должна проводиться такая сертификация.

Алексей ОРЕШКО

КЛУБ "СВЯТЛІЦА"

Нядаўна ў Слоніме распачаў сваю дзейнасць клуб "Святліца".

Днямі ў гарадской бібліятэцы №4 адбылася выстаўка вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што зрабілі дзеці з гэтага клуба. Былі прадстаўлены работы з саломкі, у тэхніцы макрамэ, мяккія цацкі, фларыстыка. Адзначым, што клуб створаны па ініцыятыве грамадскага аб'яднання "Воля да развіцця". Як паведаміла кіраўнік клуба Таццяна Буланава, з верасня ў "Святліцы" пачнуць працаваць гурткі па інтарэсах.

Алесь ЦІШКЕВІЧ



Дзеці клуба "Святліца"

"Приношу в дар Родине... труд и жизнь"

Порой за суетой будничных забот, в ежедневных хлопотах о хлебе насущном мы забываем о пище духовной, забываем о прекрасном мире искусства и о людях этого мира, о людях, чьи славные имена знакомы миллионам, и чей талант, чей гений не перестают восхищать. Только вот о своих-то знаменитых земляках мы забывать просто не имеем права.

В 2000 году исполнилось 270 лет со дня рождения и 200 лет со дня смерти Михаила Казимира Огинского, государственного деятеля, композитора, писателя, который создал в Слониме театр, балетную и музыкальную школы, типографию, построил канал, получивший впоследствии его имя. В начале октября исполнится 235 лет со дня рождения Михаила Клеофаса Огинского. Это имя у большинства из нас ассоциируется с его знаменитым полонезом, ставшим неофициальным гимном нашего города.

Михаилу Клеофасу, как наследнику одного из знатнейших родов Речи Посполитой, предназначалась карьера государственного деятеля, политика и дипломата. И он оправдал надежды своего отца, но музыка с ранних лет захватила его и стала спутником всей жизни...

Огинский жил в то время, когда его Родина теряла свою национальную независимость и делилась соседними странами. Он не мог быть в стороне от патриотического движения за независимость Речи Посполитой. "Приношу в дар Родине свое имуще-



Михаил Клеофас ОГИНСКИЙ

ство, труд и жизнь", — заявил Михаил Клеофас, примкнув весной 1794 года к восстанию за независимость, возглавленному



Михаил Казимир ОГИНСКИЙ

Тадеушем Костюшко. На свои деньги Огинский снарядил отряд повстанцев, сам участвовал в боях.

"Я сочинил марш для моего отряда стрельцов... Писал также военные и патриотические песни, которые пользовались большим успехом, так как возбуждали храбрость, энергию и энтузиазм моих товарищей по оружию", — так изменились музыкальные устремления, подчинившись требованиям времени. Существует даже предположение, что именно Огинским была создана мелодия боевой песни "Еще Польша не погибла", которая впоследствии стала гимном.

Что же, помимо чинов, чрезвычайных миссий, ожиданий и разочарований, стало итогом этой богатой событиями жизни? Осталось свыше двадцати полонезов, четыре вальса, четыре марша, три мазурки, романсы, песни, интереснейшие мемуары...

Шло время, облик автора постепенно уходил в прошлое, обрастал мифами, черты стирались, забывались... И вот, единственное, что, пожалуй, по-прежнему свежо и живо — прелестный полонез ля минор, известный под названием "Прощание с Родиной" или просто как "Полонез Огинского". Мелодия, которую мы знаем с самого раннего детства, которая как бы существовала всегда.

И тем обиднее, что память о Михаиле Клеофасе Огинском в Слониме никак не увековечена.

Валерий КОВАЛЕНКО

Іверс і Леўчык гучаць па-украінску

У артыкуле "Хачу не проста жыць..." вучоны і паэт, ураджэнец Слоніма Алег Лойка пiшча ў 1982 годзе пісаў: "Я люблю вершы А.Іверса пра лес — "Хтось расчэсваў зялёныя сосны"... Што і казаць, гэты верш і мой адзін з найлюбых.

Падчас наведвання гасціннага і ўтульнага дома Іверсаў у Слоніме па вуліцы Дабрыяна, 8 у верасні 1994 года паэт па маёй просьбе двойчы чытаў "Хтось расчэсваў зялёныя сосны". А ў 1999 годзе паэт Антон Цвід, які нарадзіўся на Валыні ў 1939 годзе і які з 1979 года жыве ў Брэсце, выдаў зборнік вершаў і перакладаў "Сторинкі хвиль". І што для мяне было цікава і радасна, у гэтым зборніку я ўбачыў пераклад верша Анатоля Іверса (1912 — 1999) "Хтось зелені розчесував сосни":

Хтось зелені розчесував сосни,
Што в замрії дивились на шлях.
Я про ночі смолісті, безсонні,
Розказати не можу ніяк.

